**Пасіяк, В**. Боль, які час не лечыць / В. Пасіяк // Пастаўскі край. — 2009. — 14 лют. — С. 3.

## БОЛЬ, ЯКІ ЧАС НЕ ЛЕЧЫЦЬ

– 24 красавіка 1982 года наша дывізія, што знаходзілася за 40 кіламетраў ад Кандагара, атрымала загад узяць горад штурмам, – так пачаў свой кароткі аповед Аляксандр Бяленка, якому давялося служыць у Афганістане паўтара года. – Гарады ў іх знаходзяцца ў далінах, таму трэба было ісці 40 кіламетраў праз горы. Гэта невялікая адлегласць, бо за ноч часам прыходзілася пераадольваць каля 2000 кіламетраў. За 3 кіламетры ад нас, непадалёк ад мяжы Пакістанам, размяшчалася авіяцыйная часць. Менавіта яна першай і пачала штурм. Услед за ёй стала дзейнічаць дальнабойная артылерыя, а потым і пяхотная дывізія, у склад якой уваходзіла і наша група з 16 чалавек. Асноўнай мэтай было прагнаць душманаў да зялёнай зоны – непралазных лясоў, пераплеценых ліянамі. У далейшым нам даводзілася праводзіць сумесныя баявыя дзеянні з іншымі дывізіямі, суправаджаць калоны з грузамі, напрыклад, з бавоўнай. Там мы прабылі да вызвалення горада – 17 чэрвеня 1982 года.

А 15 лютага 1989 года савецкія войскі пакінулі Афганістан…

З таго часу прайшло 20 гадоў. Мне і маім аднагодкам гэтыя падзеі вядомы толькі па фільмах і кнігах. Нам цяжка ўявіць, што трыццаць тысяч беларускіх салдат змагалася на той вайне. Мы з цікавасцю чытаем раман Святланы Алексіевіч «Цынкавыя хлопчыкі», з захапленнем глядзім шматлікія фільмы пра вайну, не задумваючыся, што сярод людзей, якія нас акружаюць, ёсць тыя, для каго толькі 20 гадоў таму вайна была жорсткай рэальнасцю. Па афіцыйных данных, у Афганістане загінуў 771 беларус, яшчэ 800 засталіся інвалідамі.

Вось і са 120 чалавек, якія накіроўваліся ў Афганістан разам з Аляксандрам Бяленкам, вярнуліся дадому толькі каля 70…

У знак памяці пра мінулыя падзеі ў Паставах на вуліцы Гагарына ўстаноўлены помнік воінам-інтэрнацыяналістам.

Сёння Аляксандр Бяленка працуе ў мірнай сферы – вадзіцелем аўтобуса ў аўтапрадпрыемстве № 17. Як і большасць тых, хто прайшоў афганскую закалку, стараецца не расказваць пра смерць. Навошта? Зразумела, што гэта вельмі страшна. Страшна, калі ў цябе на руках памірае сябар, калі не вяртаюцца тыя, хто яшчэ не паспеў адчуць смак жыцця…

Сёння вядзецца многа спрэчак наконт таго, ці быў сэнс у той вайне. Ва ўсякім разе, яна ўжо стала гісторыяй, пакінула след у памяці грамадства. Ды і не вернеш людзей. А тыя, хто спазнаў усе страхі Афганістана, не хочуць, каб нашы людзі зноў прайшлі праз гэта. Магчыма, менавіта таму нам і патрэбна трывалая памяць…

**В. Пасіяк**